- выбраць аптымальны арыгінальны варыянт задумы для далейшай яго распрацоўкі;

- генерыраваць новыя ідэі ў абраным напрамку да канчатковага ажыццяўлення задумы творчай работы.

Дз'ячэнка В.С.,
дацэнт

## АСНОЎНЫЯ НАКІРУНКІ ПАВЫШЭННЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ ПРАЦЭСУ ПРАФЕСІЙНАГА НАВУЧАННЯ СТУДЭНТАЎ

Прафесійнае навучанне можна ахарактарызаваць як мэтанакіраваны працэс стымулявання знешняй і ўнутранай актыўнасці навучаемага пры фарміраванні ў яго прафесійных ведаў, навыкаў, уменняў і якасцей асобы, уласцівых дадзенай спецыяльнасці. Яны забяспечваюць паскораную адаптацыю спецыяліста да ўмоў працы і дасягненне поспеху ў ёй. Зыходзячы з гэтага, задачай выкладчыка з'яўляецца забеспячэнне перадачы навучэнцу інфармацыі (гэта не толькі вусныя паведамленні якія мы адносім да выніку кожнай працэдуры, што вызначае выбар некалькіх варыянтаў з многіх магчымых) у патрэбным аб'еме, у патрэбны час і ў патрэбнай форме. Эфектыўнасць рашэння гэтай задачы выкладчыкам магчыма пры рэалізацыі ў працэсе навучання наступных праблем.

- Асноўная мэта выкладчыка заключаецца ў скарыстанні такой сістэмы стандартаў ацэньвання дзейнасці, якая забяспечвае яе эфектыўнасць.

Калі няма стандартаў прафесійнай дзейнасці, кожную змену дзейнасці цяжка растлумачыць. У рэалізацыі гэтай мэты ёсць тэарэтычныя і практычныя цяжкасці. Яны перш за ўсе звязаны з пошукам крытэрыяў, якія апісваюць заданні ў працэсе навучання, уключаючы эфектыўнасць іх выканання, якасць і дакладнасць вынікаў, працягласць работы, памылкі, адказы і затрымкі.

- Выбар аптымальных сродкаў навучання, якія забяспечваюць дасягненне мэт прафесійнай падрыхтоўкі ў найкарацейшы час і з мінімальнай затратай сілы навучэнца. Адной з цяжкасцей працэсу навучання прафесіі тут выступае разнастайнасць і рознабаковасць вывучаемых тэм, пры гэтым іх узаемазалежнасць не адразу прыкметна для навучэнца.

- Станоўчы перанос вынікаў навучання на прафесійную паспяховую дзейнасць спецыяліста.

Рашэнне вышэйзначаных праблем праводзіцца ў вучэбных курсах «Асновы мэнеджмэнту» і «Асновы прадпрымальніцтва». Засвоіўшы гэтыя курсы, спецыяліст атрымлівае рэальныя веды і спасцігае прынцыпы, па якіх развівае бізнес з пункту гледжання мэнеджэра (розных узроўняў кіравання), а таксама ўладальніка ўласнага прадпрыемства. Акрамя таго, названыя вывучаемыя курсы разлічаны не толькі на забеспячэнне эфектыўнасці навучання для работы ў сферы культуры, але і ў іншых галінах народнай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь.

Гліннік Т.М.,
дацэнт

## ВЫВУЧЭННЕ ГІСТАРЫЧНА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ЯК СПОСАБ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАФЕСІЙНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВЫКЛАДЧЫКА І СТУДЭНТА

Матэрыяльная і духоўная культура, з'яўляючыся важнейшай часткай нацыянальнай спадчыны, заўсёды была адным з асноватворных накірункаў фарміравання самасвядомасці народа, яго суверэнітэту, дзяржаўнасці. Трэба адзначыць, што рэалізацыя гэтага накірунку ў нашай рэспубліцы праходзіць вельмі цяжка, таму што, як сведчаць статыстычныя звесткі і сацыялагічныя апытанні, мы мала цэнім і выкарыстоўваем матчыну мову, родную гістарычна-культурную спадчыну.

Прайшло больш за два гады з дня прыняцця закона Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гістарычна-культурнай спадчыны», у якім зроблены захады да вызначэння асноўных яе паняццяў, шляхоў па стварэнню неабходных умоў духоўнага, інтэлектуальнага і эканамічнага развіцця грамадства. Да гэтага часу, на жаль, мы нідзе не знойдзем азначэння, што такое спадчына. На гэта пытанне спрабуе адказаць Адам Мальдзіс у артыкуле «Спадчына - наш неацэнны скарб», напісаным у 1989г.: «... гэта ўсе тыя скарбы духоўнай і матэрыяльнай культуры, якія засталіся нам ад папярэдніх пакаленняў і якія мы, збярогшы і памножыўшы, павінны, абавязаны перадаць сваім нашчадкам» (Мальдзіс А. І ажываюць спадчыны старонкі// Выбранае. - Мн.: Маст. літ., 1994. - С.18).

І да сённяшняга дня вырашаецца пытанне, як зрабіць «беларусамі саміх беларусаў» (па трапнаму выразу А.Мальдзіса), як развіць нацыянальны менталітэт у самых розных сферах, і ў першую чаргу - у адукацыйнай.

У праграме падрыхтоўкі мэнеджэраў сацыякультурнай сферы ёсць курс «Культурна-гістарычная спадчына беларусаў». Мізэрная колькасць гадзін практыкуму, на наш погляд, патрабуе ад выкладчыка і студэнта вялікай падрыхтоўкі і сапраўднага майстэрства, каб выявіць рэзервы ўдасканалення педагагічна-вучэбнай дзейнасці па выпрацоўцы уменняў і



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ